Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 МАЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №98 (28462)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Радыё «Беларусь» святкуе 55-годзе**

СТАР. 5



**Як адгукаецца чалавечы выбар**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАЎХУТА, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Акрамя вырашэння першачарговых задач, якія стаяць перад геолагамі Беларусі па вывучэнні нетраў, павелічэнні здабычы нафты, варта асаблівую ўвагу ўдзяляць нарошчванню экспарту геалагічных паслуг. Асаблівыя дамоўленасці, якія датычацца працы нашых спецыялістаў, існуюць з Расійскай Федэрацыяй. Таксама наш вопыт цікавы Судану і Егіпту, якія я нядаўна наведваў і дзе абмяркоўваліся пытанні пошуку не толькі вуглевадародаў, але і іншых відаў карысных выкапняў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8520 | ▼ |
| Еўра | 2,0802 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0330 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0704 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# З «малочнага» рэйса




Па гэтым надпісе на малочнай бочцы жыхары вёсак Ляхі, Слабада, Сарочына, Чарсцвяды, Загор'е пазнаюць, хто кіруе трактарам. Васіль ГАРБАЦЕНКА дзесяць гадоў працуе ў малочным сектары аграпрадпрыемства «Арэхаўна» Ушацкага раёна. На сваім «Беларусе» ён забяспечвае работу палявой даільнай установкі і дастаўляе сырадой у халадзільную камеру. У летні пашавы сезон Васіль пачынае свой працоўны дзень у пяць гадзін раніцы, а вяртаецца дадому амаль у прыцемках. Наш фотакарэспандэнт Анатоль КЛЯШЧУК зрабіў гэтае фота позна ўвечары ў вёсцы Ляхі, калі трактарыст вярнуўся дахаты, дзе яго радасна сустрэў шчанюк лайкі Альф.

■ Дом, дзе я жыву

## ЛЕПШ ЗА ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦУ

### Жыхары шматпавярховіка самастойна даглядаюць месцы агульнага карыстання

**У Жодзіне ёсць дом па вуліцы Дзеравянкі пад нумарам 6. Ён выглядае лепш за дамы, якія былі пабудаваныя разам з ім 55 гадоў таму. Розніцу відаць і пры ўваходзе ў пад'езд. Тут, напрыклад, на дзвярах няма размытага дажджом, пажоўклага ад часу шматцця папер ад рэкламных аб'яў. Для аб'яў усталявана спецыяльная дошчачка. Побач змешчана шыльда з прозвішчамі і кантактнымі тэлефонамі старасты дома, участковага інспектара міліцыі, адказнай асобы з жыллёва-камунальнай арганізацыі, дэпутата гарадскога Савета.**



— У 2013 годзе ў горадзе праводзіўся конкурс на найлепшы пад'езд. Мы занялі першае месца і атрымалі прэмію. Уладальнікі кватэр прынялі рашэнне патрацiць яе на новыя вокны са шклопакетамі. І цяпер у нас не толькі прыгожа, але і цёпла. Нядаўна за свае грошы купілі дываны, каб людзі не насілі нагамі пясок. Усё, што вы тут бачыце, набытае за асабістыя сродкі. А вазонамі, карцінамі жыльцы самі ўпрыгожваюць лесвічныя пляцоўкі, — расказала **старшая па пад'ездзе Наталля ПРАВІЛАВА.**

СТАР. 3

■ «Звязда» даследуе праблему

## Працаўладкаванне без меж

### Стэрэатыпы замінаюць знайсці работу людзям з інваліднасцю, а ў маладых і здаровых яе могуць адабраць робаты

**У нас у краіне больш за паўмільёна людзей з інваліднасцю. Ці часта мы бачым іх на вуліцы? На самай справе — часта, але звычайна нават не здагадваемся, што перад намі чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, калі ён не ў інвалідным калясцы ці не з белым кіем у руцэ.**

**Гэта раней такіх людзей быццам бы не існавала. Зараз жа пра іх пішуць у СМІ, здымаюць тэлеперадачы. Людзі з інваліднасцю нарэшце сталі паўнапраўнай часткай грамадства. Тым не менш ім усё яшчэ трэба даказваць свае правы на нармальнае жыццё.**

**Што дапамагае нам жыць паўнавартасна? Праца. А з гэтым — вялікія праблемы, зрэшты, як і ў многіх здаровых людзей. Але здаровым прасцей канкураваць на адкрытым рынку працы, хоць сусветная тэндэнцыя да скарачэння працоўных месцаў неўзабаве прымусіць напружыцца ўсіх...**

**Чаго ж насамрэч баіцца работадаўца, калі бачыць перад сабой чалавека з інваліднасцю?**

**Адзін з найвялікшых розумаў нашай планеты жыве ў цалкам паралізаваным целе...**

Давайце будзем шчырымі, работадаўца думае прыблізна наступнае: навошта мне інвалід са сваімі праблемамі, ён будзе працаваць няпоўны працоўны дзень і не так хутка, як здаровы, для яго трэба ствараць спецыяльныя ўмовы... І потым, як такі чалавек увальецца ў калектыў? Лепш я вазьму звычайнага здаровага работніка. Нават калі мне давядзецца заплаціць штраф, ён невялікі і не паўплывае на маё фінансавае становішча...

Гэта так — рынак працы глядзіць у першую чаргу на тое, што вы можаце рабіць. Дадатковыя льготы, якія закон гарантуе чалавеку з інваліднасцю, адпуджваюць наймальнікаў і не дазваляюць бачыць у ім прывабнага работніка. Індывідуальная праграма рэабілітацыі часам значна звужае магчымасці чалавека з інваліднасцю і зноў жа адпуджвае работадаўцу: многае, што там напісана, яму, не медыку, проста не зразумела.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# НЕ ЗГУБІЦЬ ПАЗІЦЫІ

## Прэзідэнт занепакоены сітуацыяй у айчынным хакеі

**Апошнім часам кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўсё часцей звяртаецца да тэзіса ідэалогіі праз спорт. Сапраўды, праца літаральна ніводнага ідэолага не можа параўнацца з маштабнасцю і эфектыўнасцю спорту. Прынамсі, калі нашы спартсмены выйграюць.**

### Няма годнай аддачы

Учора ў Палацы Незалежнасці прайшла нарада па пытаннях развіцця хакея ў Беларусі. Гэты від спорту адыгрывае ў нас вялікую ролю і ідзе ў гэтым плане нароўні з футболам — а то і знаходзіцца на пазіцыю вышэй. Падчас чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе, які праходзіў у Мінску, нацыянальная зборная паказала добры вынік — сёмае месца. Апошнім жа часам мы губляем свае пазіцыі. У сістэме нацыянальнага хакея ёсць шэраг праблемных пытанняў. На працягу найбліжэйшых гадоў усе яны павінны быць пераадолены. У 2021-м Беларусь стане адной з гаспадынь чарговага чэмпіянату свету, важна, каб айчынныя балельшчыкі змаглі атрымліваць ад гульні беларускай каманды выключна станоўчыя эмоцыі.

Выступаючы падчас нарады, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: справа не ў тым, што Прэзідэнт гуляе ў хакей. Гэта — адзін з наймаштабнейшых відаў спорту, хакейныя матчы глядзяць мільёны. І што адчуваюць беларусы, калі нацыянальная зборная каторы раз саступае, прычым не самым моцным сапернікам?

— Калі мы ўжо прынялі рашэнне займацца гэтым відам спорту, развіваць яго — ён у нас стаў вельмі папулярным, — ну дык давайце па-сапраўднаму займацца, — заклікаў кіраўнік краіны. — Але вынікі агідныя. Мы правалілі Алімпійскі кваліфікацыйны турнір, саступіўшы зборнай Славеніі, якая зорак з неба не хапае. Другі год запар балансуем на мяжы вылету з наймацнейшай групы на чэмпіянаце свету.

У многім гэта вынік таго, што ўнутраны чэмпіянат так і не стаў фабрыкай падрыхтоўкі рэзерву. У той жа час у хакей укладваюцца істотныя сродкі: 18% — груба кажучы, пятая частка — ад усіх выдаткаў на фізічную культуру і спорт з улікам сродкаў падтрымкі з усіх крыніц. Годнай жа аддачы, адзначае кіраўнік дзяржавы, няма.

Ён прызнаўся, што незадаволенасць балельшчыкаў дайшла і да яго:

— Замест гонару за колеры свайго сцяга пасля вашых гульняў балельшчыкі проста абураюцца. Яны ўжо мне пачалі пісаць лісты. І я з імі згодны — абсалютна бязвольныя выступленні, адсутнічае камандная гульня, не кажучы ўжо аб індывідуальным майстэрстве. Ды і трэнерская работа агідная. Хакей — гэта не барацьба, гэта бітва. На яе трэба выходзіць як на апошні бой.

### Вырашальны — 2021 год

Разам з Латвіяй мы дабіліся права правесці чэмпіянат свету па хакеі ў 2021 годзе. Прэзідэнт прызнаўся, што за некалькі тыдняў да прыняцця камітэтам адпаведнага рашэння Беларусі прапаноўвалі саступіць на карысць Фінляндыі. Як бы там ні было, права на правядзенне адной з самых грандыёзных падзей спартыўнага жыцця ўсяго свету цяпер за намі. Вялікая заслуга ў гэтым, па словах Аляксандра Лукашэнкі, нашых партнёраў — латышоў:

— Гэта яны прапанавалі мне направіць ўступіць у барацьбу за гэты чэмпіянат свету. І тады я, сустракаючыся з Фазелем (прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазель — **заўв. рэд.**), яму пра гэта сказаў. Ён паабяцаў: гэта — ідэя, вы можаце з фінамі пазмагацца. Іншая справа, што там традыцыйныя нашы сябры нас не падтрымалі. Але гэта ўжо іншае пытанне і асобная размова.

Акрамя гэтага, заяўка не была б падтрымана, калі б у 2014 годзе мы не прадэманстравалі нашу магчымасць прымаць спартыўныя мерапрыемствы такога ўзроўню. Так ці інакш, прынцыпова важна, каб наша зборная аказалася падрыхтаванай да гэтай падзеі.

### Нават з лёдам не ўсё гладка

Пэўным поспехам на юнацкім і юніёрскім узроўнях не трэба ўдзяляць занадта шмат увагі. Так, на чэмпіянаце свету наша каманда да 20 гадоў выйшла ў вышэйшы дывізіён. Каманда да 18 гадоў захавала прапіску ў эліце, а хакеісты да 17 гадоў нядрэнна правялі некалькі турніраў у Канадзе і Турцыі.

— Гэта ўсё добра. Нам патрэбныя рэзультаты ў канчатковым рахунку. А канчатковы рахунак — гэта нацыянальная зборная і як мінімум клуб «Дынама», — кажа Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час Прэзідэнт агучыў пэўныя негатыўныя тэндэнцыі. Напрыклад, ёсць праблемы з трэнерскім складам.

А здараецца, не хапае і інвентара, і... лёду. Дакладней, часу для заняткаў на катках, бо часта дырэкцыя аддае перавагу аказанню пэўных платных паслуг грамадству. Адпаведна, дзіцячыя і юнацкія каманды займаюцца менш, чым гэта патрэбна для развіцця неабходнага ўзроўню прафесіяналізму.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу: сачыць за развіццём хакея ў сваёй вобласці павінны непасрэдна губернатары, у раёне — старшыні райвыканкамаў. Пры неабходнасці павінен быць забяспечаны падвоз дзяцей з раёнаў на заняткі ў хакейныя школы.

### На роўных умовах

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся і больш блізкімі планамі: як і з чым мы ідзём у новы сезон Кантынентальнай хакейнай лігі? Які набіраем склад, якіх залучаем спецыялістаў, якія ставім задачы?

Кіраўнік краіны звярнуўся і да сістэмы аплаты працы хакеістаў. Не павінна быць ніякіх павышэнняў зарплат без выніку. Грошы — толькі за рэзультат. Гэта нармальная сістэма, якая працуе і ў іншых краінах, напрыклад у Канадзе, дзе хакей з'яўляецца, без перабольшвання, нацыянальным культам:

— Не будзе ніякіх грошай, пакуль не дасце нармальны прадукт. Будзе вынік — будзе зарплата. Вы ведаеце мае патрабаванні.

### Легіянеры — ці патрэбны яны?

У суботу на пасаду старшыні Федэрацыі хакея быў абраны Сямён Шапіра. Звяртаючыся да яго, кіраўнік дзяржавы адзначыў: важна падабраць штат, які дапаможа яму, новаму старшыні Федэрацыі, эфектыўна працаваць. Прэзідэнт таксама нагадаў, што, акрамя працы ў арганізацыі, на Сямёна Шапіру будзе ўскладзена яшчэ і дзяржаўная нагрузка.

У сваім дакладзе падчас нарады новы старшыня Федэрацыі хакея імкнуўся ахапіць усе складанасці развіцця гэтага віду спорту ў краіне. На яго думку, прапанаваная адмова ад замежных трэнераў пацягне за сабой пагаршэнне вынікаў. Так, па інфармацыі, агучанай Сямёнам Шапірам, па статыстыцы, пад кіраўніцтвам замежных трэнераў каманды выходзілі на добрыя вынікі. Тое ж самае датычыцца і працы ў нас замежных гульцоў. Многія з іх з'яўляюцца лідарамі ў беларускіх камандах і рэзкая адмова ад легіянерскіх паслуг выкліча зніжэнне якасці гульні нашых камандаў. У той жа час можна адмаўляцца ад гэтага паступова.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Юбіляр

# Наша стыльная і строгая «Думка»

**95 гадоў таму выйшаў у друк першы нумар грамадска-палітычнага і навукова-папулярнага часопіса «Беларуская думка».**

На святочнай сустрэчы, прысвечанай юбілею часопіса, **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** зачытаў віншаванне, якое накіраваў у адрас рэдакцыі Аляксандр Лукашэнка: «За сваю доўгую гісторыю ваша выданне змяніла некалькі назваў, але сутнасць яго дзейнасці засталася нязменнай: перадача чытачу праўдзівай, актуальнай інфармацыі пра жыццё краіны. Аб'ектыўнае асвятленне падзей, што адбываюцца ў свеце, адстойванне нацыянальных інтарэсаў і духоўна-маральных каштоўнасцяў нашага народа. Сёння «Беларуская думка» — гэта аўтарытэтны грамадска-палітычны і навукова-папулярны часопіс, які займае годнае месца сярод лідараў айчыннай журналістыкі».

— У інфармацыйнай прасторы сучаснай Беларусі больш за 1600 перыядычных выданняў. Яны з'яўляюцца штогод, але паверце, не кожнаму па сілах гэтак жа магутна і сістэмна працаваць у спектры якаснай, агульнапалітычнай, агульнанацыянальнай прэсы, — адзначыла ў сваім выступленні **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Таму ў суверэннай беларускай дзяржаве адна «Беларуская думка», якая гуртуе вакол сябе найлепшыя сілы: палітолагаў, дзеячаў грамадства, навукі, культуры і адзін з найлепшых рэдакцыйных калектываў.

Павіншаваць з юбілеем рэдакцыю часопіса прыйшлі не толькі прадстаўнікі ўлады, але і важныя для выдання людзі, госці і калегі. Сваімі ўспамінамі дзяліліся Уладзімір Вялічка, які ўзначальваў калектыў амаль два дзесяцігоддзі, і Вадзім Гігін, які таксама быў галоўным рэдактарам выдання. Акрамя слоў віншавання, рэдакцыя «Беларускай думкі» і яе супрацоўнікі атрымалі ўзнагароды за плённую творчую працу. **Галоўны рэдактар часопіса Аляксандр САМОВІЧ** падзяліўся тым, якой ён бачыць будучыню часопіса:

— Мы стараемся крочыць разам з часам, улічваць колькасць інфармацыйных тэхналогій, якія цяпер з'явіліся. Але адначасова не хацелася б бачыць, што часопіс ператвараецца ў інтэрнэтнае выданне. Чытачу павінна быць прыемна вярнуцца, дакрануцца да любімых тэкстаў не толькі душой, але і пагартаць у руках старонкі. Наша выданне адначасова і строгае, і стыльнае, і калі казаць пра яго сучасную місію, то хацелася б пакінуць яго надзейным сябрам, дарадчыкам не толькі для дзяржаўнага служачага, які хоча прыняць правільнае кіраўніцкае рашэнне, але і для выкладчыкаў, аспірантаў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by* ■

■ Парламенцкі дзённік

CEI CENTRAL EUROPEAN INITIATIVE

# ПАКАЖАМ СЯБЕ Ў СФЕРЫ ІТ-ТЭХНАЛОГІЙ

## На пасяджэнне ЦЕІ ў Мінск прыедуць прадстаўнікі парламентаў 12 краін

**У наступны аўторак, 30 мая, наша краіна прыме прадстаўнікоў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы — арганізацыі, якая аб'ядноўвае краіны Еўрапейскага саюза і яго найбліжэйшых суседзяў. Дакладней, у беларускай сталіцы адбудзецца пасяджэнне Парламенцкага камітэта парламенцкага вымярэння ЦЕІ. Для Беларусі ўдзел у арганізацыі — магчымасць пашырыць і ўмацаваць рэгіянальнае супрацоўніцтва, актывізаваць уключэнне ў еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы.**



Дэвіз беларускага старшынства — прасоўванне сумяшчальнасці ў Еўропе, развіццё ўсяго спектра ўзаемадносін як паміж краінамі рэгіёна, так і Еўрапейскім саюзам, Еўразійскім эканамічным саюзам, краінамі Усходняга партнёрства. Пра гэта "Звяздзе" паведаміла **Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Беларусі ў парламенцкім вымярэнні ЦЕІ.**

Галоўная тэма пасяджэння — «Інтэлектуалізацыя эканомікі ў рэгіёне ЦЕІ: інавацыйная вытворчасць, кіраванне і чалавечы капітал». Ірына Старавойтава растлумачыла, што выбраная тэма звязана з сучаснымі тэндэнцыямі ў эканоміцы: ростам навукаёмістасці тавараў, павышэннем жорсткасці канкурэнцыі, якая прыводзіць да неабходнасці пастаяннага ўкаранення інавацый. Таму пасяджэнне парламенцкага камітэта — гэта магчымасць прадэманстраваць дасягненні нашай краіны ў галіне інавацыйнай вытворчасці, развіцця ІТ-тэхналогій, чалавечага капіталу, навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці.

У пасяджэнні плануецца ўдзел членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікоў шэрагу міністэрстваў, а таксама парламенцкіх дэлегацый Аўстрыі, Сербіі, Славеніі, Румыніі, Польшчы, Малдовы, Харватыі, Балгарыі, Славакіі, Венгрыі, Італіі, Украіны. Вынікам мерапрыемства стане прыняцце дакумента, у якім замацоўць прынцыпы сумеснай працы ў сферы інтэлектуалізацыі эканомікі ў рэгіёне ЦЕІ.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by* ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Керы заклікаў амерыканскіх студэнтаў вучыць рускую мову



Былы дзяржсакратар ЗША Джон Керы падчас свайго выступлення перад амерыканскімі студэнтамі даў ім параду вывучаць рускую мову. Урыўкі з яго прамовы перад навучэнцамі Школы кіравання імя Джона Кенэдзі пры Гарвардскім універсітэце ў штаце Масачусетс прывяла газета Politico.

«Мне часта задаюць пытанне, у чым сакрэт рэальнага ўплыву на ўрад. Што ж, усё змянілася не так даўно. Гледзячы сёння на Белы дом, я сказаў бы, што трэба купіць падручнік і вучыць рускую мову», — заявіў экс-дзяржсакратар.

Керы раскрытыкаваў прэзідэнта ЗША Дональда Трампа: «Для кіраўніка дзяржавы, якая ўзяла першую папраўку *(да канстытуцыі ЗША аб свабодзе слова. — **Рэд.**)*, ненармальна кожны дзень зневажаць журналістаў і нават пагражаць ім. І гэта ненармальна, калі кіраўніка ФБР бесцырымонна звальняюць з-за таго, што ён расследаваў уплыў Расіі на выбарчую кампанію таго самага чалавека, які яго звольніў».

### Надзея Саўчанка заявіла, што гатовая стаць прэзідэнтам Украіны

Пра гэта дэпутат Вярхоўнай рады расказала ў інтэрв'ю выданню «Krytyka Polityczna».

«Я гатова ўзяць на сябе адказнасць за краіну і выставіць сваю кандыдатуру на прэзідэнцкіх выбарах. У парламенцкіх выбарах будзе ўдзельнічаць мая палітычная сіла», — цытуе словы Саўчанкі Gordon.ua.

Дэпутат растлумачыла, што ў парламенцкіх выбарах прыме ўдзел партыя «Грамадзянская платформа Надзеі Саўчанкі», якая, на яе думку, «павінна дэмантаваць нездаровую палітычную сістэму» і «перабудаваць дзяржаўную архітэктуру».

Таксама дэпутат прызналася, што яе праект будзе мець падтрымку алігархаў і СМІ.

Саўчанка, якая раней была асуджана ў Расіі па справе аб забойстве журналістаў у Данбасе і якая была памілавана прэзідэнтам Пуціным, — пазафракцыйны дэпутат Вярхоўнай рады. У снежні мінулага года ўкраінскія палітыкі раскрытыкавалі яе за паездку ў Мінск, дзе яна сустрэлася з кіраўнікамі ДНР і ЛНР. Пасля гэтага Саўчанку выключылі з фракцыі «Бацькаўшчына» і дэлегацыі ПАСЕ.

### Туск заявіў пра адсутнасць агульнай пазіцыі Еўрасаюза і ЗША па Расіі

У Еўрасаюза і ЗША няма агульнай пазіцыі ў дачыненні да Расіі, заявіў старшыня Еўрапейскага савета Дональд Туск пасля сустрэчы кіраўнікоў інстытутаў ЕС з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам у Брусэлі.

«Я не магу сказаць, што ў нас на 100% ёсць агульная пазіцыя ў дачыненні да Расіі. Аднак што датычыцца канфлікту на Украіне, падобна, што мы на адной лініі», — сказаў Туск журналістам пасля завяршэння перагавораў. Ён паведаміў, што бакі абмеркавалі пытанні знешняй палітыкі, бяспекі, гандлю і экалогіі.

# ПРАВА І СЛОВА

## Найлепшыя публікацыі прававой тэматыкі атрымалі ўзнагароды



Галоўную ўзнагароду конкурсу на прыз імя У. Спасовіча — статуэтку, што ўвасабляе сабой законнасць і літаратурны талент, атрымалі найлепшыя аўтары прававой тэматыкі. Спаборніцтва юрыстаў, журналістаў, адвакатаў і іншых аўтараў за 14 гадоў існавання конкурсу сёлета стала самым масавым — на суд журы даслана 130 работ.

— Гэта сведчанне таго, што ўзнагарода стала жаданай і прэстыжнай сярод юрыдычнай грамадскасці. Было настолькі цяжка абіраць пераможцаў, што ў намінацыях «Навука і права» і «Права і журналістыка» мы прысудзілі па дзве статуэткі, — зазначыў **міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ**. — А таксама ўвялі дзве новыя пазіцыі: «Пракуратура» і «Следства».

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МАЦКЕВІЧ** заўважыў, што «конкурс ужо набыў устойлівую традыцыю, колькасць удзельнікаў павышаецца, а ўзровень работ неймаверна ўзрос».

Галоўныя ўзнагароды і дыпломы за найбольш цікавыя публікацыі і выніковую працу па папулярызацыі права такім чынам прысуджаліся ў 11 намінацыях. **Супрацоўніца газеты «Звязда» Ірына СІДАРОК** таксама стала адной з трох дыпламантаў, атрымаўшы ўзнагароду з рук **міністра інфармацыі Лілії АНАНІЧ.** «Права і журналістыка», дарэчы, была самай масавай па колькасці ўдзельнікаў намінацыяй — за званне самых лепшых тут змагаліся 23 журналісты.

### Сумесная прамая тэлефонная лінія «Звязды» і Полацкага райвыканкама

У гэтую суботу, 27 мая, адбудзецца сумесная прамая тэлефонная лінія **намесніка старшыні Полацкага райвыканкама Аляксандра КАЛАДЫНСКАГА** і рэдакцыі газеты «Звязда». Час правядзення — з 9.00 да 12.00. Нумар тэлефона для зваротаў: 8-0214-42 22 25.

Пытанні, якія хвалююць жыхароў Полацкага раёна, а таксама тое, як яны вырашаюцца, знойдуць адлюстраванне на старонках нашага выдання. Газета «Звязда», як заўсёды, застаецца вашым верным сябрам і карысным дарадчыкам.

Практыку правядзення сумесных прамых ліній з кіраўнікамі мясцовай улады мы будзем працягваць і надалей.

# ЛЕПШ ЗА ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Госці, якія прыходзяць у гэты дом, здзіўляюцца чысціні і ўтульнасці ў месцах агульнага карыстання. Жыхары тут адмовіліся ад паслуг прыбіральшчыцы і самі па чарзе займаюцца прыборкай. Уладальнікі, якія адчулі сябе сапраўднымі гаспадарамі, лічаць, што лепш, як яны, ніхто не навядзе парадак. Разам з тым і нейкую капейчыну можна сэканоміць, каб у наступным пусціць яе на куплю фарбы, будаўнічых матэрыялаў, касметычны рамонт.

Такую ініцыятыву падтрымліваюць і мясцовыя камунальнікі. На абслугоўванні ў арганізацыі 277 жылых дамоў. Набраць прыбіральшчыц для кожнага праблематычна. «Мы зацікаўлены, каб жыхары самі сачылі за чысцінёй або прыцягвалі да прыборкі клінінгавыя кампаніі. У межах Закона аб сумесным домаўладанні яны маюць на гэта права», — кажуць спецыялісты «Жодзінажылцеплассэрвісу».

У доме тры паверхі, 12 кватэр. Усе яны прыватызаваныя. Жывуць тут людзі з сярэднім дастаткам. Тыя, хто спачатку не згаджўся аддаваць на агульную справу грошы, убачыўшы вынік, свае стаўленне памянялі. Жыхары суседніх дамоў зайздросцяць.

— Людзям здаецца, што нехта староннi ў нас навёў парадак, добраўпарадкаваў дваровую тэрыторыю. Але мы самі ўсё зрабілі сваімі рукамі, — кажа Наталля Правілава. — Восенню, напрыклад, склаліся на фарбу для бардзюраў. З цягам часу нешта зношваецца, прыходзіць у заняпад. Таму над абнаўленнем інтэр'еру, выгляду месцаў агульнага карыстання даводзіцца працаваць пастаянна. Усім нам, хто тут жыве, хочацца, каб у пад'ездзе было прыгожа і ўтульна, але для гэтага трэба прыкласці рукі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ

**Наталля СУШКО, старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Выканаўчай уладай, арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі шмат робіцца па добраўпарадкаванні, навядзенні парадку на вуліцах, дваровых тэрыторыях. Але для нас вельмі важна падключыць да агульнай работы гараджан. Сёння мы вельмі актыўна працуем з насельніцтвам праз органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. І гэтыя намаганні прыносяць плён. У кожным доме ёсць староста, старшыя па пад'ездах. Гэта людзі, якія адказваюць за стан пад'ездаў, уваходных вузлоў, лавак, дзіцячых гульнявых пляцовак. Яны нашы першыя памочнікі, падказваюць, дапамагаюць рэалізуюць разам з намі праекты. Гэтыя людзі не скардзяцца, а менавіта падымаюць тыя пытанні, якія мы сумеснымі сіламі можам вырашыць. Да работы падключаны і дэпутаты гарадскога Савета.

■ Работа для маладых

# Сябе паказаць, на свет паглядзець

## Беларускія студатрадаўцы будуць працаваць у Расіі і Польшчы

**Для студатрадаўцаў сёлета зацверджана каля 44 тысяч працоўных месцаў. Працягнецца практыка маладзёжных будоўляў. Сярод аб'ектаў — Гомельская абласная дзіцячая клінічная бальніца, Астравецкая цэнтральная раённая бальніца, транспартная развязка ў Брэсце.**

Моладзь вельмі зацікаўлена ў выязных студатрадах. Сёлета заключана 14 дагавораў на працу прыкладна 500 чалавек за мяжой. У асноўным гэта сэрвісныя і педагагічныя атрады ў Расіі.

— У будучым збіраемся выйсці на Еўрасаюз. Вядуцца перагаворы з Польшчай. Мяркуецца, што каля 200 чалавек змогуць там працаваць, — дзеліцца планамі **выконваючая абавязкі другога сакратара Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Эліна БРАГА.**

Найбольш папулярныя студатрады — будаўнічыя, сэрвісныя, медыцынскія. У непаўналетніх попытам карыстаюцца сельскагаспадарчыя атрады, вытворчыя і экалагічныя. Заробак — не ніжэйшы за мінімальны (для тых, хто заняты на паўнацэнным працоўным тыдні). Больш за ўсіх традыцыйна атрымліваюць у будаўнічых атрадах (летась заробкі гэтых «байцоў» складалі ад 400 да 1200 рублёў), але і патрабаванні там высокія.

Цяпер, дарэчы, рэгіёнам прапануюць выказаць прапановы па ўдасканаленні работы студатрадаў, каб улічыць гэтыя нюансы ў далейшым. Першыя рэкамендацыі ўжо паступілі. Так, прапануюць павялічыць колькасць людзей у атрадзе (цяпер максімум — 30 чалавек), фарміраваць атрад не за месяц, а за 10 дзён, каб хутка рэагаваць на сітуацыю на рынку працы. Хочуць таксама спрасціць працэдуру ўзгаднення атрадаў: рабіць гэта на ўзроўні не аблвыканкамаў, а горада ці раёна.

Працаваць летам моладзь можа не толькі ў складзе студэнцкіх брыгад. Службы занятасці прапануюць хлопцам і дзяўчатам займацца азеляненнем і добраўпарадкаваннем тэрыторыі, рамонтам мэблі і кніг у школах.

— Часовае працаўладкаванне моладзі арганізуецца ва ўсіх раёнах рэспублікі. Гэта вельмі важны аспект выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў, — кажа **кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацабароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.** — Сёлета памер фінансавання на арганізацыю занятасці навучэнцаў павялічаны на 10 працэнтаў, да 5,2 мільёна рублёў. Плануецца ўладкаваць 23,6 тысячы чалавек.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ — ЦЁПЛА І СУХА

## Май вярнуўся ў звыклае «рэчышча»

**Па інфармацыі службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, у выхадныя ў Беларусі чакаецца цёплае сухое надвор'е. Увогуле на гэтым тыдні май быў шчодрым на сонечныя дні, а тэмпературны фон заставаўся ў межах кліматычнай нормы.**



У пятніцу, 26 мая, умовы надвор'я будзе вызначаць вільготная няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Ноччу пераважна па паўднёва-ўсходніх раёнах, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—12 градусаў, днём паветра прагрэецца да 17—23 градусаў цяпла.

У суботу, 27 мая, будзе пераважна без ападкаў, толькі па ўсходзе Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—10 градусаў вышэй за нуль, днём будзе ад плюс 15 па паўночным усходзе да плюс 22 па паўднёвым захадзе краіны.

У нядзелю, 28 мая, будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 градусаў вышэй за нуль. Днём — 14—21 градус цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 22—27.

У панядзелак, 29 мая, чакаецца цёплае няўстойлівае надвор'е. Атмасферны фронт абумовіць ноччу ў асобных раёнах, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 градусаў вышэй за нуль. Днём — 18—25 градусаў цяпла, у паўднёвых раёнах паветра прагрэецца да плюс 28.

У апошнія дні мая надвор'е ў краіне будуць вызначаць малаактыўныя франтальныя раздзелы і больш свежыя паветраныя масы, якія паступаюць са Скандынавіі. У аўторак, 30 мая, у асобных раёнах Беларусі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 градусаў вышэй за нуль. Днём — 16—23 градусы цяпла, па поўдні паветра прагрэецца да плюс 25. У сераду, 31 мая, у асобных раёнах краіны не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, днём магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў, днём — 16—23 градусы цяпла.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Маскоўскае прывітанне ад земляка-паэта

**У Расіі выйшла кніга вершаў Анатоля УСАВА — нашага земляка, які нарадзіўся на Гомельшчыне.**

Зборнік «Спатканне» — гэта не толькі вершаваныя сустрэчы творцы з лірычнай гераіняй кнігі, але і спатканне земляка са сваёй роднай старонкай. Нарадзіўся Анатоль Усаў на Гомельшчыне, у Веткаўскім раёне. Многія гады жыве і працуе ў Маскве. За плячыма — багаты жыццёвы вопыт, удзел у многіх грамадска-палітычных ініцыятывах. Анатоль Усаў часта выступае ў друку па пытаннях беларуска-расійскай інтэграцыі.

А вершы ў зборніку «Спатканне» надрукаваны на беларускай і рускай мовах. Перакладчыкамі твораў таленавітага паэта, члена Саюза пісьменнікаў Расіі выступілі Мікола Мятліцкі, Юлія Алейчанка, Валерыя Саротнік.

Сустрэча з новай кнігай земляка, які працуе ў Маскве, нагадала пра тое, што ў Расійскай Федэрацыі і сёння жыве шмат літаратараў — ураджэнцаў Беларусі. Толькі ў Маскве — паэты Любоў Турбіна, Валерый Ліпневіч, празаікі Алесь Кажадуб, Іван Сабіла, Валерый Казакоў, літаратуразнаўца Аляксей Каўка, Антаніна Шэлемава. У іншых старонках Расіі — паэты, празаікі, публіцысты Уладзімір Шугля, Сяргей Мартынкевіч ды і шмат хто яшчэ. Чаму б не скласці анталогію іх твораў і не выдаць яе ў Беларусі? Паверце, на кожнай старонцы такога выдання будзе нямала добрых слоў пра родны край, нашу Айчыну.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Добрая навіна

# Паліца літасці

**«Аксана», «Дашачка» і «Наталля». Менавіта ў крамах, якія названы гэтымі жаночымі імёнамі, з'явяцца «Паліцы дабра».**

Сёння адбудзецца адкрыццё дабрачыннага праекта Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. У харчовых крамах усталяваны спецыяльныя паліцы, дзе пакупнікам прапануецца купляць і пакідаць розныя прадукты для маламаёмных грамадзян. Мяркуецца, што іх будуць браць бясплатна тыя людзі, якія не могуць сабе дазволіць купіць самае неабходнае. Намеснік старшыні абласной арганізацыі Алеся Касцюк расказала, што праект з'яўляецца пілотным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Пры паспяховай рэалізацыі і запатрабаванасці будуць усталёўваць аналагічныя паліцы і ў іншых крамах Гомельскай вобласці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# «Абібок» у паветры

**«Белавія» будзе прадастаўляць на борце дзіцячае харчаванне.**

Дзіцячае харчаванне гандлёвай маркі «Абібок» і авіякампанія «Белавія» запусцілі сумесны праект па прадастаўленні дзіцячага харчавання на борце. Ён арыентаваны як на самых маленькіх, так і на дзетак больш старэйшага ўзросту. У маі ў бартавым меню з'явіцца асартымент дзіцячага харчавання «Абібок», дзякуючы чаму маленькія пасажыры змогуць бясплатна падсілкавацца ў час палёту. Раней авіякампанія не прапаноўвала харчаванне самым юным пасажырам ад 0 да 2 гадоў, а дзеці ад 2 да 12 гадоў атрымлівалі той жа рацыён, што і астатнія. Пасля ўкаранення дзіцячага рацыёну спецыяльнае харчаванне будзе прапаноўвацца пасажырам ад 0 да 12 гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

26 мая — 60 гадоў сумеснага жыцця нашых дарагіх, любімых бацькоў — **АЛЕШКІ Аркадзія Дзмітрыевіча і АЛЕШКІ Зоі Фёдараўны**, якія пражываюць у вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна. Мы, дзеці, унукі і праўнукі, віншуем іх з брыльянтавым вяселлем.

*Не старейте,*
*милые родители.*
*Счастья Вам,*
*здоровья, долгих лет!*
*В Вас всегда мы светлый*
*образ видели.*
*Никого у нас роднее нет!*
*За тепло, за души Ваши*
*добрые и за то,*
*что Вы растили*
*нас,*
*За заботу*
*и терпенье*
*долгое, пусть*
*Вам Бог*
*здоровья даст.*



■ Сацыяльныя тэхналогіі

# «ШТУРМАН» ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ



tut.by

## Праграма стане вачыма людзей з праблемамі зроку

**Ідэнтыфікаваць лекі, надпісы на якіх далёка не заўжды можна распазнаць з дапамогай шрыфту Брайля. Атрымаць лічбы з лічыльнікаў святла ці вады або прачытаць змест рукапіснага тэксту, які ніводзін сканер дагэтуль не здольны распазнаць, каб перавесці ў зручны для невідушчых фармат. Нарэшце проста засцерагчыся ад небяспекі, калі ў дзверы звоняць незнаёмыя людзі, якія прадстаўляюцца супрацоўнікамі розных органаў. Гэтыя простыя справы становяцца выпрабаваннем для тых, хто не бачыць, і абысціся без дапамогі іншых цяжка. Вачыма для невідушчых становяцца валанцёры, якія праз смартфоны ў рэжыме анлайн дапамагаюць сарыентавацца ў прасторы. Новая праграма «Штурман» робіць гэты працэс яшчэ больш зручным.**

### Карысная самастойнасць

— Праграма перш за ўсё скіравана на зусім невідушчых людзей, якія будуць карыстацца ёй сітуатыўна, а не штодзённа. Гэта не дапамога па суправаджэнні ва ўсіх бытавых справах, — расказаў **Міхаіл АНТОНЕНКА, намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па зроку.** — Мы ўжо не адно дзесяцігоддзе прапагандуем самастойнасць невідушчага чалавека і даём пэўныя навыкі жыцця без зроку. «Штурман» жа ставіць чалавека ў прамую залежнасць ад таго, хто яго накіроўвае. Такое суправаджэнне можа спатрэбіцца толькі час ад часу, калі ўжо няма іншага выйсця.

Ва ўсім свеце людзі з праблемамі зроку карыстаюцца праграмай, выпушчанай у ЗША, аналагічныя праекты (пакуль безвыніковa) спрабавалі стварыць у Расіі. Айчынны прадукт, распрацаваны спецыялістамі групы кампаній «Белхард» літаральна за пяць месяцаў, развіваецца пры тэхнічнай падтрымцы МТС і ўжо эксплуатуецца беларускімі карыстальнікамі.

10-гадовы Паша, напрыклад, асвоіў новы рэсурс за некалькі тыдняў. Ён жа стаў і першым тэсціроўшчыкам праграмы — самастойна хадзіў у кафэ ў суправаджэнні штурмана.

— Гэта вельмі неабходная і карысная праграма. Штурманам пакуль што выступаю я. Паша сам ходзіць у краму, быў у кафэ. У перспектыве — самастойны рух на аўтобусах. Спачатку думала, што не маю права як маці адпускаць яго аднаго, аднак псіхолаг і юрыст сказалі, што гэта нармальна, — падзялілася мама хлопчыка Алёна Петрачук.

Як расказаў **кіраўнік праекта кампаніі «Белхард» Арцём ГАРБАЦЭВІЧ**, менавіта Паша і натхніў спецыялістаў на распрацоўку мабільнай праграмы:

— Так склалася, што мы пераехалі ў новы офіс непадалёк ад кампактнага месца пражывання людзей з праблемамі зроку. Аднойчы мы ўбачылі ў парку Пашу і вырашылі нечым яму дапамагчы.

### Якасныя валанцёры і выпрабаванні чэргамі

Мяркуецца, што валанцёрамі будуць не выпадковыя людзі. Развіваць супольнасць штурманаў распачнуць перш за ўсё сярод знаёмых і сваякоў людзей з праблемамі зроку, а таксама сябровў арганізацый, якія займаюцца рашэннем сацыяльных праблем людзей з інваліднасцю. Пры гэтым для камфортнага карыстання праграмай на аднаго невідушчага павінна прыходзіцца тры валанцёры, бо не заўжды ў чалавека ёсць магчымасць дапамагчы.

Айчынная праграма дазваляе захоўваць відэазапісы стасункаў штурмана і невідушчага ў архіве. Гэтую функцыю прапанавалі, каб павысіць кантроль над сітуацыяй, калі невідушчаму спатрэбіцца дапамога. Пры гэтым будуць зафіксаваны непрыемнасці, што могуць здарыцца падчас такіх стасункаў: некарэктныя паводзіны або непрафесіяналізм пры аказанні дапамогі.

— Штурман павінен правільна сарыентаваць чалавека. Ад самага прымітыўнага — не пераблытаць «права» і «лева» — да такіх складаных пытанняў, як наведванне выстаўкі. Здараецца, што чалавек з добрай душой аказвае дапамогу невідушчаму некваліфікавана, бо не ведае, як зрабіць гэта якасна, — растлумачыў Міхаіл Антоненка. — Цэнтр паспяховага развіцця чалавека сумесна з нашым таварыствам будзе дапамагаць валанцёрам, якія захочуць аказваць прафесійную дапамогу невідушчым праз праграму «Штурман», асвоіць дэскрыпцыю, пэўную тэрміналогію, каб уяўляць асаблівасці ўспрыняцця інфармацыі невідушчымі.

Чэргі часта становяцца для невідушчых сапраўдным выпрабаваннем і катастрофай. Не існуе карэктных тэхналогій, якія дазвалялі б людзям з праблемамі зроку своечасова рухацца ўслед за папярэднімі. Кранацца асоб, каб даведацца, дзе яны, нельга — і ў такой сітуацыі жыццёва патрэбны парады валанцёра, які стане вачыма невідушчага. Дапаможа такі штурман і прасторава сарыентавацца на вуліцы, калі раптам «пілот з асаблівасцямі» заблукае. Праграма стане палачкай-выручалачкай, што дапаможа невідушчым не толькі справіцца з некаторымі бытавымі праблемамі, але і дазволіць наведваць розныя культурныя мерапрыемствы, спадзяецца Міхаіл Антоненка.

Праграма працуе па прынцыпе відэачата, запэўніваюць распрацоўшчыкі. Невідушчаму дастаткова запусціць яе на смартфоне і націснуць кнопку выкліку. «Штурман» сам падбярэ валанцёра, гатовага дапамагчы ў гэты момант. Як праграма працуе на практыцы, можна было паназіраць падчас экскурсіі па выстаўцы арт-праекта «Імёны», дзе Антаніна Сцебур, куратар выстаўкі, стала штурманам для невідушчых гасцей і іншых прысутных.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

# Працаўладкаванне без меж

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але ўсё гэта можна пераадолець. **Дырэктар сацыяльнага прадпрыемства «АртІдэя» Наталля АМПЛЕЕВА** расказала пра вопыт работы з работадаўцамі спецыялістаў «Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» («БелАДДІіМІ»):

— Наш спецыяліст бярэ з сабой хлопца ці дзяўчыну з інваліднасцю, едзе да работадаўцы і расказвае яму: вось у гэтага чалавека такія праблемы, каб ён паспяхова працаваў і ўліўся ў калектыў, неабходна тое і тое... У выніку часта аказваецца, што не так усё страшна, як спачатку ўяўлялася. І што інвалід можа быць выдатным работнікам. Трэба толькі ўсё растлумачыць, у тым ліку і праграму індывідуальнай рэабілітацыі, што дазволена і што супрацьпаказана такому супрацоўніку...

**Намеснік старшыні «Беларускага таварыства глухіх» Святлана ГАНЕЕВА** прапануе ідэю конкурсаў прафесійнага майстэрства, у якіх прымалі б удзел людзі з інваліднасцю. «Добра, каб зарадзіўся такі рух, — кажа яна. — Тады кожны атрымае магчымасць на свае вочы пераканацца, як могуць працаваць такія людзі».

Сапраўды, гэта важна — пераадольваць падобныя ментальныя бар'еры ў грамадстве. Бо часта нашы стэрэатыпы заснаваныя на недахопе інфармацыі.

— Не так даўно лічылася, што месца жанчыны на кухні, а людзі з не белым колерам скуры прызначаныя толькі для ручной работы. І да гэтага часу многія лічаць, што людзей з асаблівасцямі развіцця трэба заключыць у спецыяльныя ўстановы і не выпускаць іх адтуль, — сказау нядаўна на прэс-канферэнцыі **прадстаўнік ПРААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА**, грамадзянін Шры-Ланкі. «Але якім быў бы свет, калі выключыць з яго людзей з абмежаваннямі?» — задаўся пытаннем Санака Самарасінха і нагадаў прысутным аб тым, што адзін з найвялікшых розумаў планеты Зямля Стывен Хокінг — жыве ў цалкам паралізаваным целе...

### Бізнес, скіраваны на вырашэнне сацыяльных праблем, сам мае патрэбу ў дапамозе

Дарэчы, у Беларусі цяпер не так ужо мала прадпрыемстваў, якія супрацоўнічаюць з людзьмі з інваліднасцю (у рамках праграмы адаптацыі работнікаў-інвалідаў да працоўнай дзейнасці). Пры гэтым дзяржава прапануе наймальнікам кампенсацыю выдаткаў на стварэнне спецыялізаваных працоўных месцаў і фінансаванне мерапрыемстваў па адаптацыі. Аднак гэтыя прадпрыемствы пасля заканчэння праграмы не працаўладкоўваюць такіх людзей. У нашай краіне рэалізуецца толькі адзін праект па суправаджальным працаўладкаванні. Гэтым займаецца ГА «БелАДДІіМІ».

Робіць першыя крокі ў нашай краіне сацыяльнае прадпрымальніцтва, якое садзейнічае інклюзіўнай занятасці не толькі людзей з інваліднасцю, але і іншых уразлівых груп. Сацыяльныя прадпрымальнікамі рухае не толькі нармальнае для бізнесмена імкненне атрымаць прыбытак, але і пачуццё адказнасці і жаданне прыносіць карысць грамадству. «Некаторых з іх падштурхнула займацца гэтым асабістая жыццёвая гісторыя, напрыклад чалавек гадуе ў сваёй сям'і дзіця з інваліднасцю. Альбо гэта людзі, якіх вельмі кранула нейкая праблема і яны хочуць яе вырашыць», — кажа **сацыяльны прадпрымальнік, кіраўнік «Лабараторыі друку», дзе працуе 50% і больш людзей з інваліднасцю, Дзмітрый КЛІМКОВІЧ**. Паводле яго слоў, гэтая матывацыя адыгрывае сваю ролю, але калі не будзе належнай дзяржпадтрымкі, то многае можа не атрымацца.

— Калі казаць пра нашу арганізацыю, то мы знаходзімся ў адным полі з іншымі камерцыйнымі арганізацыямі і ў тых жа ўмовах, — тлумачыць Дзмітрый Клімковіч. — Але нашы работнікі з інваліднасцю менш канкурэнтаздольныя на рынку працы, чым усе астатнія. Калі мы не будзем працягваць дзяржаўныя праграмы падтрымкі сацыяльных прадпрымальнікаў, то з кожным годам колькасць працаўладкаваных людзей з інваліднасцю будзе змяншацца.

Нам, сацыяльным прадпрымальнікам, не хапае спецыяльных кампетэнцый. Мы выходзім на эканамічны рынак з выдатнымі мэтамі змяніць жыццё да лепшага, але пачынаецца тысяча самых розных праблем. Я быў бы рады, каб дзяржава або нейкі бізнес-інкубатар, або канфедэрацыі прадпрымальнікаў навучалі сацыяльных прадпрымальнікаў, напрыклад, маркетынгу і іншаму — каб мы сталі больш канкурэнтаздольнымі.



З Дзмітрыем Клімковічам згодная і Наталля Амплеева. «Мы не патрабуем грошай, — запэўнівае яна. — Але чаму б не выкарыстаць нямецкі вопыт, дзе дзяржава кансультуе сацыяльныя прадпрыемствы пры адкрыцці новага бізнесу?»

А **Салман РАШАД, выконваючы абавязкі дырэктара ўнітарнага прадпрыемства «Дарога ў жыццё» (ГА «БелАДДІіМІ»)** са Століна, на якім працуюць людзі з фізічнымі і разумовымі абмежаваннямі, падымае праблему адсутнасці кадраў. «Няма каму курыраваць работу з людзьмі з інваліднасцю, — гаворыць ён — Калі думаем пра тое, каб адаптаваць інвалідаў праз нашы прадпрыемствы і дзяржава аплачвае гэтую праграму праз цэнтры занятасці, то трэба падумаць і аб тым, каб было каму адаптаваць. Было б добра, калі б аплата працы майстра субсідзіравалася хоць бы на самай мінімальнай стаўцы».

Да таго ж раней сацыяльныя прадпрыемствы падтрымліваліся з дапамогай дзяржзаказаў, адзначаюць эксперты. Потым у нейкі момант з'явіўся дакумент, каб дзяржпрадпрыемствы рабілі закупкі толькі ў дзяржаўных устаноў. У выніку прыватныя прадпрыемствы, якія займаюцца сацыяльнымі праектамі, пазбавіліся ўстойлівага рынку збыту.

### А самі людзі з інваліднасцю гатовыя працаваць?

У цэлым, як адзначаюць эксперты, стаўленне да людзей з інваліднасцю — поўнае стэрэатыпаў з боку і наймальнікаў, і работнікаў працоўных калектываў, і грамадства ў цэлым. «Адаптацыя працоўнага месца пад патрэбы чалавека з абмежаванымі магчымасцямі каштуе грошай, — кажа **эксперт Швейцарскага Чырвонага Крыжа Раіса СІНЕЛЬНІКАВА.** — І калі гэта будзе рабіца пад канкрэтнага чалавека, то выдаткі будуць нашмат большымі ў параўнанні з тым, што наймальнік атрымае ад гэтага чалавека. Але калі б адаптавалі ўсё прадпрыемства, то выдаткі былі б таксама вялікімі, але пры гэтым аднаразовымі і потым бы акупіліся і далі б эфект не толькі сацыяльны, але і эканамічны». Яна прапануе правесці акцыю «Дзяржава — узорны наймальнік», паставіўшы задачу: «на кожным дзяржаўным прадпрыемстве і ва ўстанове працуе 5% асоб з інваліднасцю». На думку эксперта, такім чынам будзе створана ролевая мадэль, пераканаўчая для ўсяго астатняга грамадства.

Сярод іншых праблем Раіса Сінельнікава адзначае і негатоўнасць саміх людзей з інваліднасцю працаваць. Гэта датычыцца маральнай гатоўнасці і гатоўнасці з пункту гледжання кваліфікацыі. На прадпрыемствах браніруюцца працоўныя месцы для такіх людзей. Але іх часам няма кім запоўніць.

Але ці трэба патрабаваць толькі ад дзяржавы? А што робіць сям'я? І што можа зрабіць? Трэба глядзець, ці можа чалавек з інваліднасцю своечасова раніцай устаць, ці здольны ён кантраляваць свае дзеянні, ці ўмее ўспрымаць працоўныя заданні. Сям'і трэба рыхтаваць сваіх асаблівых дзяцей да жыцця...

* * *

І напрыканцы — аб тым, што датычыцца ўжо абсалютна ўсіх, у тым ліку маладых і здаровых. Ва ўсім свеце зараз прасочваецца тэндэнцыя да скарачэння працоўных месцаў. Інфармацыйная рэвалюцыя, рабатызацыя, новыя тэхналогіі ўжо сёння замяняюць людзей. Таму, думаючы пра працаўладкаванне людзей з інваліднасцю, мы павінны разумець, што неўзабаве гэта будзе не толькі іх праблемай. Гэта будзе праблемай і для многіх іншых. Таму ўжо цяпер трэба задумацца, дзе нам выкарыстоўваць свой патэнцыял і на якія спецыяльнасці аддаваць вучыцца дзяцей. Эксперты сцвярджаюць, што работнікі будуць запатрабаваныя ў сферы інфармацыйных тэхналогій, у сферы паслуг і догляду хворых і пажылых людзей, там, дзе можна будзе працаваць дыстанцыйна, у творчых спецыяльнасцях...

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

**...Сваё 55-годдзе міжнароднае радыё «Беларусь» адзначае цалкам у штатным працоўным рэжыме. І нават падчас нашай гутаркі з галоўным дырэктарам радыё Навумам ГАЛЬПЯРОВІЧАМ да яго ўвесь час зазіраюць супрацоўнікі, каб вырашыць неадкладныя бягучыя пытанні. Што зробіш — кругласутачнае вяшчанне на васьмі розных мовах абавязвае жыць у напружанні.**

■ Ёсць нагода

# НА ЎСЕ «ПЯЦЁРКІ»!

## Міжнароднае радыё «Беларусь» адзначае юбілей



**— Далёка не кожны справіцца з такім аб'ёмам і тэмпам працы — напэўна, застаюцца толькі самыя творчыя паліглоты-працаголікі?**

— А яшчэ праца на нашым радыё робіць чалавека вялікім патрыётам Беларусі — бо, каб пастаянна расказваць замежнікам пра нашу краіну, трэба яе любіць. Некаторыя могуць нас упікнуць — маўляў, вы лакіроўшчыкі, паказваеце толькі станоўчае. На гэта я заўжды адказваю: добрая гаспадыня, калі запрашае гасцей, сустракае іх усім найлепшым, а не зламанай мэбляй і непрыбранай хатай. Так і мы расказваем іншаземным слухачам пра тое, чым сапраўды ганарымся.

### «РЫЗЫКОЎНАЯ СПРАВА»

Самае маладое з падраздзяленняў радыё «Беларусь» — кітайскамоўнае, якое існуе ўсяго 5 гадоў. «Спачатку, — прызнаецца Навум Гальпяровіч, — вяшчанне на кітайскай падавалася справай дастаткова рызыкоўнай і выклікала хваляванні. Па-першае, гэта мова нездарма лічыцца адной з самых складаных у свеце, па-другое, мы сумняваліся, ці будзе запатрабаванасць у такой вялікай краіны, як Кітай, у навінах і праграмах пра нашу невялікую для іх краіну? Дзеля эксперыменту «па знаёмых» адшукалі некалькіх грамадзян КНР: піянерамі беларуска-кітайскага радыёэфіру сталі выкладчык БДУ, паэт-перакладчык Лі Цзо і выкладчыца адной з мінскіх гімназій Ван Юн Хун, якія агучвалі першыя праграмы на кітайскай мове, падрыхтаваныя беларускімі журналістамі. Потым да іх далучыліся і нашы спецыялісты: Вераніка Карлюкевіч, якая мае спецыяльную адукацыю і досвед працы ў Кітаі, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ Чжан Хайянь і іншыя. Акрамя таго, вельмі прыемна, што наша ініцыятыва знайшла разуменне і падтрымку ў пасольства КНР: да нас прыязджаў былы пасол спадар Гу Цзін Вэй, добрыя стасункі склаліся і з цяперашнім паслом Цуй Цымінам і супрацоўнікамі дыпмісіі... І атрымалася, што вяшчанне на кітайскай мове заваявала пэўную папулярнасць як сярод супрацоўнікаў сумесных прадпрыемстваў, якія жывуць і працуюць у Беларусі, так і ў грамадзян КНР, якія хочуць больш даведацца пра культуру, навуку і прамысловасць, гісторыю і сучаснасць, турыстычны патэнцыял нашай краіны. Дастаткова сказаць, што ў кітайскіх сацыяльных сетках WeChat колькасць падпісчыкаў нашай афіцыйнай старонкі перавышае 50 тысяч чалавек!»

**Патэнцыяльная аўдыторыя слухачоў складае каля 500 мільёнаў чалавек.**

Прынцыповая навіна сучаснага перыяду — значная актывізацыя работы радыё «Беларусь» у інтэрнэце. На сёння ў нас створаны старонкі на ўсіх мовах вяшчання, ёсць анлайн-трансляцыя ўсіх праграм, якія ідуць у FM-дыяпазоне, — так што цяпер можна слухаць нас і перапісвацца з рэдакцыяй літаральна з любога пункта свету. А дзеля таго каб прыцягнуць увагу новых слухачоў і падтрымаць цікавасць ужо існуючай аўдыторыі, мы прадумалі серыю інтэрактыўных акцый. Пачалі, напрыклад, з конкурсу сэлфі, асноўным заклікам якога было «Перадай прывітанне Беларусі!». Водгукі на гэту акцыю мы атрымалі з 80 краін свету, — з гонарам заўважае Навум Гальпяровіч, — а ў некаторыя дні колькасць наведвальнікаў сайта, дзе можна было прагаласаваць за ўпадабаныя здымкі, дасягала соцень тысяч чалавек! Натхнёныя такім поспехам, мы пайшлі далей і прыдумалі праект «#clickBelarus» — гэта такая своеасаблівая інтэрнэт-віктарына, 7 пытанняў пра Беларусь з фотаздымкамі, дзе можна выбраць варыянты адказаў і праверыць свае веданне нашай гісторыі і сучаснасці. Шчыра кажучы, некаторыя пытанні і мяне (а я адным з першых, як капітан карабля, пратэсціраваў новы праект) прымусілі добра паламаць галаву.

**— І як у выніку — адгадалі?**

— Памятаю, выйшла шэсць правільных адказаў з сямі, так што нейкае пытанне ўпусціў. Але ідэя, на маю думку, усё адно атрымалася вельмі цікавай і карыснай, прычым як для замежнікаў, так і для саміх беларусаў. (На хвіліначку, сярод пераможцаў віктарыны аказаліся слухачы з Расіі, Кітая, Польшчы, Непала, Нігерыі і нават Трынідада і Табага! — **Аўт.**) Не меншую цікавасць выклікаў і наступны наш праект — інтэрактыўны конкурс «Кніга для ўсяго свету», або #BOOKSGOGLOBAL, прысвечаны не толькі кнігам і чытанню наогул, але і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, каб нагадаць пра Беларусь як радзіму ўсходнеславянскага першадрукара. Сутнасць конкурсу простая: мы папрасілі слухачоў сфатаграфавацца са сваёй любімай кнігай — у кагосьці гэта беларускія аўтары, у іншых — сусветная класіка або сучасныя літаратары. Многія суправаджаюць фота падрабязным расказам, чаму выбралі менавіта гэту кнігу, прызнаюцца ў любові, напрыклад, да лірыкі Максіма Багдановіча. Геаграфія водгукаў прыемна ўражвае: так, напрыклад, каля 30 здымкаў даслалі нам школьнікі з Глыбоччыны, а разам з тым на заклік адгукнуліся слухачы з такіх далёкіх краін, як Індыя і Бангладэш. Конкурс працягваецца і цяпер, а мы ўжо задумваемся над тым, каб запусціць падобны цікавы праект для нашых суайчыннікаў за мяжой — бо мы ж не толькі расказваем свету пра Беларусь, але і пэўным чынам злучаем беларусаў, якія з розных прычын жывуць у іншых краінах свету.

### ЗАЎЖДЫ НА СУВЯЗІ

**— Інтэрактыўныя праекты, прасоўванне медыя ў сацыяльных сетках — усё гэта вельмі модныя сёння штукі, але ці не атрымліваецца так, што іх прыдумвае і рэалізуе моладзь для моладзі?**

— Ніколькі. Каб гэта не прагучала нясціпла, скажам такім чынам: ідэю падаваў я, а «раскручвалі» яе ўжо нашы маладыя супрацоўнікі. Разумееце, ідэя зваротнай сувязі заўжды лунае ў паветры, трэба толькі вырашыць, як яе рэалізаваць.

Сама сутнасць інтэрактыву — стасункі ў сацыяльных сетках, «лайкі», перапосты — гэта ўсё больш цікава для маладых людзей, а я, са свайго боку, задумаўся, як можна гэтыя модныя захапленні выкарыстаць менавіта для нашага радыё. Бо, на мой погляд, тут ёсць вялікая розніца: звычайна СМІ выкарыстоўваюць інтэрактыў, каб заахвоціць аўдыторыю да нейкіх спрэчак, дыспутаў, гарачых абмеркаванняў. Наша ж задача — не справакаваць бурную рэакцыю, не закінуць у інтэрнэт-сметніцу штосьці «смажанае», але пачуць водгукі з таго боку радыёпрыёмнікаў, даць людзям у свеце як мага больш цікавай і карыснай інфармацыі пра Беларусь. Вось дзеля гэтага мы выкарыстоўваем абсалютна ўсе даступныя магчымасці: гасцявую кнігу на сайце, старонкі ў сацыяльных сетках, электронную і звычайную пошту — і, заўважу, у век, калі ўжо мала хто піша папяровыя лісты, да нас часам прыходзяць такія кранальныя пасланні... Многія рэчы, для нас вядомыя і звычайныя, выклікаюць у замежнікаў жывы водгук. Так, скажам, адна слухачка з Францыі прызналася, што толькі з нашых праграм даведалася пра Віцебск — радзіму Марка Шагала — і загарэлася ідэяй пабываць у гэтым горадзе, прасіла расказаць пра яго больш падрабязна.

**— Ці ёсць у замежнай аўдыторыі пэўныя, скажам так, нацыянальныя адметнасці — скажам, адны больш ахвотна ўключаюць перадачы пра эканоміку і бізнес, другім даспадобы культура і гісторыя?**

— Наша культура, гісторыя, беларуская музыка, ад «Песняроў» да фальклорных калектываў і сучасных гуртоў, выклікаюць цікавасць у большасці слухачоў наогул. Нам тут унутры часам падаецца, маўляў, колькі можна круціць «Песняроў», надакучыла адно і тое ж — але рэч у тым, што ў вялікім свеце дагэтуль вельмі мала ведаюць пра нашу музыку і з вялікай ахвотай яе слухаюць! Я, магчыма, правяду даволі далёкую паралель, але Арцём і Ксюша, якія прадстаўлялі сёлета Беларусь на «Еўрабачанні», выканалі сёлета місію музычна-культурных паслоў, паказаўшы мільёнам замежнікаў, што ёсць беларусы, якія спяваюць на сваёй мове, і што гэта натуральна і прыгожа. Так і нашы слухачы заўжды з ахвотай слухаюць «Старога Ольсу», «Троіцу», «Песняроў» — усё тое, што нясе з сабой нацыянальны каларыт. Што да пэўных слухацкіх пераваг, то, сапраўды, нямецкія слухачы больш цікавяцца эканамічнай тэматыкай — гандаль, беларускія тавары, прадпрыемствы, цэны; кітайцы праяўляюць інтарэс да арганізацыі і развіцця сумесных прадпрыемстваў, а таксама да практычных парад тым, хто прыехаў жыць і працаваць у Беларусь і хоча лягчэй інтэгравацца ў грамадства. Ну і, вядома, усе без выключэння адзначаюць карысць перадач пра нашу прыроду і турыстычныя адметнасці, пра новыя маршруты; у дапамогу патэнцыйным турыстам нашы вядучыя ў праграме «Дзень краіны» расказваюць навіны мытнага і пагранкамітэта. Наогул, пералічыць увесь спектр тэм, якія мы асвятляем і якія запатрабаваны ў слухачоў, досыць цяжка, бо наша мэтавая аўдыторыя надзвычай шырокая. Але, безумоўна, галоўны акцэнт робім на ўнутры- і знешнепалітычным жыцці Беларусі, і праграмы на грамадска-палітычныя і сацыяльныя тэмы (у тым ліку з удзелам экспертаў — вядомых палітолагаў, дыпламатаў, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў) займаюць у агульным аб'ёме вяшчання 65%.



Юбілей калектыў радыё «Беларусь» сустрэў на працы.

**Спачатку праграмы гучалі толькі на беларускай мове. З 1985 года пачалося вяшчанне на нямецкай, а з 1998 — на англійскай і рускай. У 2006-м гэты спіс папоўніла польская, у 2010-м — іспанская і французская, у 2012-м — кітайская мова.**

**— 55 гадоў — час не толькі падводзіць пэўныя вынікі, але і прымаць падарункі...**

— Вялікіх свят, шчыра кажучы, мы не плануем, бо зусім нядаўна разам з пасольствам Кітайскай Народнай Рэспублікі правялі вялікую і вельмі добрую прэзентацыю — падвядзенне вынікаў творчага конкурсу эсэ, які доўжыўся цэлы год. Так што свой дзень нараджэння сустракаем на рабочых месцах, хоць, вядома, і з віншаваннямі, граматамі і падзякамі ад Белтэлерадыёкампаніі. Вырашылі так: вось дажывём да 60-годдзя — тады адзначым сапраўды шырока і маштабна. Адзін падарунак мы зрабілі сабе самі: прысвяцілі эфіры дзень 22 мая гісторыі радыё «Беларусь», больш падрабязна расказалі пра сваіх супрацоўнікаў. Спадзяюся, з цягам часу ўдасца рэалізаваць і яшчэ адну даўнюю мару — зрабіць сучасны, разгалінаваны інтэрнэт-партал, з фотарэпартажамі, з тэкставымі перадачамі на розных мовах, з мабільным вяшчаннем і г. д. Самае галоўнае, што нас павіншавалі слухачы з розных краін свету, сардэчна падзякавалі за працу і запэўнілі, што наша праца — патрэбная і карысная для іх.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
*tselyashuk@zviazda.by*

## «СМАЧНАЕ ЛЕТА СА «ЗВЯЗДОЙ»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 8 ліпеня 2017 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.



Набор мебели садовой Tarifa lounge wikbrw-std lounge

Сярод падпісчыкаў 12 ліпеня 2017 года будуць разыграны 7 мангалаў Forester і суперпрыз — набор садовай мэблі Tarifa longe. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 ліпеня 2017 г.



Мангал Forester BC-761 с шампурами

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня 2017 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2017 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» чытайце ў нумары 95 газеты «Звязда» ад 23.05.2017 г.

Тэлефон для даведак: (017) 284 44 04.

Тэрмін правядзення гульні — з 26.05.2017 па 30.09.2017.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3002 ад 16.05.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

____________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)

____________ на III квартал або II паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ____________

____________

____________

Удачы ў розыгрышы!

## Аўторак, 30 мая

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».*****
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар.
**11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Гаспадыня».*****
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маёр і Магія».*****
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Нашы.
**15.45, 16.05** «Выратуйце нашу сям'ю».***
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.40** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**0.15** Дзень спорту.
**0.30 Серыял «Апошняя сустрэча».*****

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.55** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Каханне і іншыя недарэчнасці...»*****
**11.05, 17.30** «Багіня шопінгу».
**11.35, 17.00 Серыял «Кухня».*****
**12.10, 20.00** «Тата папаў».
**14.05,21.45, 22.10** «Паненкасялянка».
**15.20, 23.55** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 23.00 Трылер «Тут нехта ёсць. Адкупленне».*****
**22.05** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.40** «Беларуская кухня». Дамашні сыр.
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15, 15.00, 20.30, 23.00** «Гэты дзень».
**8.25, 17.55 «Узнятая цаліна». Драма. 1-я серыя.***
**10.00, 13.10 «Ціхі цэнтр». Меладрама. 1-я і 2-я серыі.***
**11.50** М/ф.*
**12.20** «Наперад у мінулае».
**12.45** «Я хачу гэта ўбачыць!» Лідскі раён.
**15.00** «Гэты дзень».
**15.05 «Чыста англійскія забойствы». Дэтэктыў. «Электрычная вендэта». 1-я серыя.*****
**15.55, 21.05** «Сакрэтныя акадэміі». Дак. фільм.*
**16.35, 21.45 «...А досвіткі тут ціхія». Драма. 1-я серыя.***
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Грані Перамогі». «Парады Перамогі». Частка 2-я.
**20.40** «Калыханка».
**23.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта-песенніка Аляксандра Лягчылава.

### Беларусь 5

**8.00, 12.00, 21.50** Тэніс. Ралан Гарос.
**10.00** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**10.45** Час футбола.
**11.30** Гульні «на вырост».
**14.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Другі матч.
**15.35** Веславанне на байдарках і каноэ. Этап Кубка свету. Сегед. Фіналы.
**17.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. 1/2 фіналу. Трэці матч. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**19.30** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. 1/2 фіналу. Трэці матч. «Хімкі» (Маскоўская вобл.) — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.20** Спорт-кадр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынское/Жаночае».
**14.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55, 23.40** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Кантрольная закупка».
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік.
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Уласік. Цень Сталіна».*****
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**0.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 17.35** «Званая вячэра».
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**11.40, 0.15 «Каманда Чэ». Серыял.**
**13.50 Камедыя «Формула кахання».***
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**15.55** «Цэнтральны рэгіён».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**1.55** «Дакументальны праект»: «Кроў нашчадкаў».

### МІР

**6.35** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**7.00** Добрай раніцы, свет!***
**8.35** «Няма праблем!»***
**10.00** «Яшчэ танней».*
**10.30** «Любімыя акцёры», Мікалай Яроменка.*
**11.00, 13.15 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».*****
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
**16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».*****
**19.20, 4.25 Серыял «Закон і парадак».*****
**22.15 Маст. фільм «Чорная сукенка».*****
**0.10 Серыял «Спрут».*****
**2.10 Серыял «Гарачы лёд».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.00** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Айцец Мацвей».**
**19.15, 20.40 Серыял «Не пара».**
**21.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**22.00, 23.10 Серыял «Парогі».**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Двайныя стандарты».
**7.10, 8.05 Драма «Мёртвае сэрца».*****
**9.00 Серыял «Мухтар. Новы след».*****
**9.45, 23.05** «НЗ.by».
**10.20 Серыял «Ляснік».*****
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Дарожны патруль».*****
**17.05 Серыял «Сведкі».*****
**21.20 Серыял «Спецкар аддзела расследаванняў».*****
**23.25** «Вынікі дня».
**23.55 Серыял «Шэф».*****

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**8.00 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».**
**9.00, 17.50 Серыял «Грандгатэль».**
**10.15 «Сябры дзядулі Марка».**
**10.30** «Мой любімы гадавалец».
**11.00 Камедыя «За бортам».**
**12.45, 19.15 Серыял «Імперыя».**
**14.15 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонс».**
**15.55, 19.10, 21.00. 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». «Маладзільныя яблычкі».
**16.50 Серыял «Я кахаю».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Версальскі раман».**
**23.05 Серыял «Футбалісты».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».***
**6.30, 4.25** «Ералаш».0
**7.30, 3.25** М/ф «Фіксікі».0
**7.50, 3.45** М/ф «Смяшарыкі».0
**8.10, 4.05** М/ф «Тры каты».0
**8.30, 15.10, 19.00** Серыял «Атэль «Элеон»-2».***
**9.30** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».*
**11.20** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**12.00, 2.10** «Лаві момант».***
**12.30, 5.10** Серыял «Я лячу».***
**13.30** «З'ешце гэта неадкладна!»***
**14.00, 20.10** Серыял «Дах свету».***
**16.20, 0.50** Серыял «Васьмідзясятыя-5».***
**16.50** Серыял «Закрытая школа-3».***
**17.50, 23.05** «Уральскія пельмені».***
**21.20** Камедыя «Голы пісталет: з паліцэйскіх архіваў».*
**0.00** Серыял «Карабель».***
**1.20** «Дурні і дарогі».***
**1.50** Серыял «Бязмоўны сведка».***
**2.40** «Не можа быць!»***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Андрэйч». Дак. фільм.
**12.55** «Эрмітаж».
**13.25** «Горад №2 (горад Курчатаў)». Дак. фільм.
**14.05** «Аніматы — новая форма жыцця». Дак. фільм.
**15.10, 21.55** «Міхайла Ламаносаў». Маст. фільм. «На славу Айчыны».
**16.35** «Гарматы перамогі канструктара Грабіна». Дак. фільм.
**17.20** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**17.50, 1.05** Туган Сахіеў і Нямецкі сімфанічны аркестр у Берліне.
**18.35** Колер часу. Павел Федотаў.
**18.45, 0.35** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Да 125-годдзя з дня нараджэння Канстанціна Паўстоўскага. «Гульня ў бісер».
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** «Разведка ў асобах. Маркус Вольф». Дак. фільм. Частка 1-я.
**23.35** Мастсавет.
**23.40** Навука без межаў. «Як думае наш мозг». Дак. фільм.
**1.50** «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.
**1.55** «Казус Кукоцкага». Серыял.***
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Ахоўвай мяне, мой талісман».***
**7.10** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Моладзь і музыка». 1986 год.*
**8.30** «КВЗ — 87—88». МДУ — ДДУ — НДУ. Фінал. 1-я частка.*
**9.30** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». Салют акцёрам свету! 1991 год.*
**9.50** Маст. фільм «Бумбараш».***
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Музычны самвыдат». 2005 год.***
**12.55** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».***
**14.05** Маст. фільм «Начны госць».***
**15.00, 21.00** «Мінулы час».*
**15.40, 17.00, 19.00, 20.40, 21.40, 23.00, 2.40** Музычная настальгія.*
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».*
**17.20** Дак. фільм «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў».*
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Біржавы рух». 2006 год.*
**19.20** Маст. фільм «Ксенія, любімая жонка Фёдара».***
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 4-я частка. 2009 год.***
**0.50** Маст. фільм «Чужая радня».***
**2.25** Тэлеспектакль «Выступленне Агніі Барто». 1974 год.
**3.00** «Быў час». 2009 год.***
**4.00** Маст. фільм «Вежа».***
**5.30** Маст. фільм «Заклад».*

### EuroSport 1

**5.30, 10.30, 22.50** Тэніс. «Ралан Гарос». Супрацьстаянне дня.
**6.30, 12.00, 0.50, 2.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**9.30** Фехтаванне. Серыя Гранпры.
**11.30, 22.15, 2.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**23.45** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**0.15** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.

### Кінакамедыя

**0.55** Прыгоды «Даспехі Бога-2».*
**2.45** Камедыя «Фартуна Вегаса».***
**4.20, 14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».***
**5.25** Камедыя «Імя».***
**7.20** Прыгоды «Санта на продаж».***
**8.50** Камедыя «Навагодні адрыў».***
**10.25** Камедыя «Блеф».***
**12.20** Камедыя «Рымскія спатканні».***
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі».***
**16.00** Камедыя «Пагоня за трыма зайцамі».*
**17.45** Камедыя «30 спатканняў».***
**19.30** Камедыя «СуперБабровы».*
**21.15** Камедыя «Мытня дае дабро».***
**23.10** Фантастыка «Усё магу».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Ёсць адзін сакрэт».
**8.25** «Доктар І...»
**8.55, 19.05, 2.30** «Вузел лёсу». Серыял.
**10.30, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**12.10** «Сляпая».
**13.10** «Варажбітка».
**14.15** «Паралельны свет».
**15.10** «Трэнд».
**15.40** «Здзелка».
**16.10** «Натуральны адбор».
**17.10** «Адкрыта».
**18.05** «Цікаўная Варвара». Серыял.
**20.50** «Ведзьмакі свету».
**21.50** «Рэвізора».
**22.50, 5.30** «Гісторыі выратавання».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Жанчына ў чорным». Трылер.***
**1.40** «Амерыканскі жаніх».

### ТБ1000

**6.10** Імгла.
**8.50** Адна сустрэча.
**10.45** Робін Гуд: мужчыны ў трыко.
**13.10** Дарагі Джон.
**15.25** Целаахоўнік.
**17.40** Там, дзе сэрца.
**20.10** Экстрасэнс.
**22.15** Дывергент.
**0.50** 11.14.
**2.25** Жнівень.
**4.25** Вёска праклятых.

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Прыстойныя людзі.
**8.15** Алёша Паповіч і Тугарын Змей.
**9.50** Мёртвыя дочкі.
**12.20** Сіняя птушка.
**14.20** Мафія: гульня на выжыванне.
**16.10** Джэнтльмены, удачы!
**18.10** Агні прытона.
**20.20** Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч.
**21.50** Бясслаўныя прыдуркі.
**23.50** ПіраМММіда.
**2.00** З пяці да сямі.
**4.20** Брат.

### National Geographic

**6.00, 13.20** Гульні розуму.*
**6.45** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.55, 14.55** Міжнародны аэрапорт Дубай.*
**8.40, 11.00, 15.40** Шаша праз пекла.*
**9.25** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.*
**10.15** Уварванне на Зямлю.*
**11.50, 16.25, 19.30, 23.30, 2.40** Расследаванні авіякатастроф.*
**12.35, 18.45, 21.55, 1.50** Пачатак.*
**17.55, 21.00, 1.00, 4.20** Геній.***
**20.15, 5.10** Навука будучыні.*
**22.40** Паранармальнае.***

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Выжыць любой цаной.*
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?*
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?*
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.*
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на складах.***
**11.00** Браты Дызель.***
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары.*
**18.00, 2.00** Геній аўтадызайну.*
**19.00, 1.00** Унікальныя тачкі.*
**20.00, 2.55** Вулічныя гонкі.***
**4.40** Маланкавыя катастрофы.***




## БЯРЫ ГАНТАЛЬ У ГАМЭРНІ

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**цуро́к** — невялікі струменьчык вады, вадкасці. *«З мяне на саматканы палавічок сцякалі цуркі вады», — чытаем у Сяргея Грахоўскага;*

**гамэ́рня** (устарэлае) — металаапрацоўчая майстэрня;

**шыбер** — засланка ў дымаходах заводскіх пячэй, газаправодах;

**ганта́ль** — цвік, якім прыбіваюць дахавы матэрыял у выглядзе дошчачак. Слова мае польскія карані;

**саладзі́льня** — памяшканне, дзе прарошчваюць зерне на солад.

**валто́рна** — медны духавы музычны інструмент. Паходзіць ад нямецкага слова Waldhorn — што значыць «паляўнічы рог»;

**мянціць языком** — 1) гаварыць упустую, пустаслоўць; 2) распускаць плёткі. Беларусы яшчэ скажуць: гарадзіць плот, плесці кашалі, паласкаць косці. Руская: чесать язык, перебирать косточки;

**перайсці дарогу** — перашкодзіць некаму, апярэдзіць некага ў нечым. Беларускія сінонімы: падставіць падножку, сапсаваць абедню, заступіць дарогу. Рускі адпаведнік: ставить палки в колёса.

Чарговы выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## Тэлесеткі

## ПА ТОЙ БОК ПАЛАТНА

**З наступнага панядзелка сацыякультурны канал «Беларусь 3» запрашае сваіх гледачоў у госці да сучасных мастакоў. Аўтары праекта падрыхтавалі цыкл фільмаў-партрэтаў «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака», які бліжэй пазнаёміць усіх ахвотных з вядомымі творцамі.**

Так, героем першай серыі «Майстэрні» стане мастак Анатоль Кузняцоў — лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, аўтар больш як тысячы карцін, якія выстаўляюцца ў многіх музеях і галерэях свету, майстар «беспрадметнага» жывапісу, які адлюстроўвае пачуцці і думкі мастака. У наступных фільмах, запэўніваюць тэлевізійнікі, гледачы не толькі станууць гасцямі творчых лабараторый беларускіх жывапісцаў, але і даведаюцца, хто з вядомых майстроў быў адлічаны з мастацкага вучылішча за прафнепрыгоднасць, а чые работы, наадварот, атрымалі такое прызнанне, што неўзабаве сталі ілюстрацыямі падручнікаў па гісторыі. Сустрэчы ў «Майстэрні» будуць адбывацца ўвечары па панядзелках.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**




## ДВА САКРЭТЫ ПРАРАБА

Нехта не дурны казаў, што жыццё — гэта серыя сустрэч...

І сапраўды: лёс зводзіць з пэўнымі людзьмі, лёс разводзіць.

З прарабам Колем мы, калі можна так сказаць, працавалі на адной будоўлі. Я, праўда, у службе заказчыка, ён — генпадрадчыка. Да таго ж — жылі непадалёк, так што зрэдку разам ездзілі ў транспарце. Дык вось, неяк у сярэдзіне і сапраўды ліхіх 90-х прыехалі мы на свой прыпынак, выйшлі з аўтобуса і толькі парукаліся, каб разысціся, як раптам скуль ні вазьміся двое здаравякоў у форме АМАПаўцаў. І спрытна так... закручваюць нам рукі, штурхаюць далей ад людзей, да нейкага будынка. А ўжо там каманды раздаюць: рукі ўгору, маўляў, далоні на сцяну, ступні на шырыню плячэй.

Я нічога не разумею, а Коля, як быццам... усё?

— Пра бетон пранюхалі... Адкуль? — шэптам пытае ў мяне.

Міліцыянеры між тым не пытаюць нічога, яны пачынаюць... нешта шукаць, абмацваць нас ад пятак да вушэй.

— Ды не маеце права! — абураюся я. — Мы будзем скардзіцца!

— Не варта, мужыкі, — міралюбіва кажа адзін з іх, пачуўшы ад другога кароткае «Не тыя». — Прабачце.

І яны абодва знікаюць, прычым гэтак жа нечакана, як з'явіліся.

Адпаведна ў нас з Міколам па камені з душы, бо са стану «палонных» мы (ура!) «выходзім на свабоду». Хоць і вельмі па-рознаму: я — душуся ад нейкага нервовага рогату, а вось Мікола асеў на траву і нават не варушыцца — тупа глядзіць у зямлю.

— Я гадзіну таму, — прызнаецца нарэшце, — самазвал бетону загнаў. Думаў, усё, капец — пранюхалі...

Пасля гэтага выпадку мы з Колем, можна сказаць, пасябравалі. Ну яшчэ б: я ведаў яго сакрэт. Хай толькі адзін, але важны! І нікому не данёс, не разбалбатаў.

Гэта, як высветлілася, праараб ацаніў. Ва ўсякім разе, калі праз тыдзень-другі мы зноўку разам выйшлі з аўтобуса, ён, пасвятлеўшы тварам, раптам сказаў:

— А пайшлі да мяне! Налью...

Чаму я згадзіўся, не ведаю: магчыма, дужа стаміўшыся быў, магчыма — згаладаўся, бо сям'я на лецішчы... Да таго ж Коля ўжо заліваўся салаўём: расказваў, якая ў яго клапатлівая жонка, якая разумная цешча, як яны абедзве кормяць яго. Штодня, маўляў, усё найсвяжэйшае... А ўжо ж якія боршчыкі, якія катлеткі...

Я — у прадчуванні — глытаў апошнія слінкі і прыспешваў крок. Аднак у пад'ездзе Коля спыніўся. Спытаў:

— Іван, а можна я цябе па-іншаму буду зваць?

— ?!

— Ну мне так трэба. Я потым скажу...

Часу на роздум у мяне не заставалася: Коля адчыняў дзверы, гукаў:

— Ніначка! Мамачка! Глядзіце, хто прыйшоў?! Гэта — Сяргей Сцяпанавіч з нашага глаўка. Я пра яго вам расказваў, помніце? А тут — каля дома сустрэў. Дык не на лаўцы ж нам з ім сядзець? Сяргей Сцяпанавіч згадзіўся зайсці — выпіць па «чарцы гарбаты».

Слухаць гэта вельмі было няёмка, але ж куды адступаць, калі «Ніначка з мамачкай» ужо кіравалі ў кухню (хоць, трэба сказаць, ніякімі катлетамі там і не пахла)...

Факт, што пакуль я ў ванным пакоі мыў рукі (а дакладней — проста хаваўся), на стале ўжо з'явілася з дзясятак розных талерак і парачка бутэлек. Мне прыйшлося ўсё каштаваць і, вядома ж, хваліць — і гаспадынь, і Міколу, як цудоўнага прараба-арганізатара, як чалавека, як (у будучыні... Чаму б і не?) начальніка аддзела, а то і галоўнага інжынера «нашага» глаўка з персанальным кабінетам, сакратаркай, з годным акладам і такімі ж прэміяльнымі!

Жанчыны слухалі. Коля — прагна еў і ўсё больш і больш чырванеў — ці то ад гонару, ці то ад гарэлкі...

А потым ён павёў мяне да прыпынку і прызнаўся, што збрыдзела ўсё, як горкая рэдзька:

— Уяўляеш, гэта баб'ё маё...

— Ніначка з мамачкай? — удакладніў я.

— Так, яны... Цэлымі днямі ні халеры не робяць, дома сядзяць. А я — ты ж будоўлю ведаеш — і намерзнуся, і замаруся, а дадому прыйду, — на стале хіба макарона ды, можа, сасіска... Затое сёння — ты ж бачыў — дзе што ўзялося, га?! А як забегалі, як закруціліся! Чалавек ты, Сяргей Сцяпанавіч! І артыст, далібог!

Коля задаволена рагатаў.

...Не раз і не два я ўспамінаў потым ягоную вячэру і думаў: а чаму гэта ні тады, ні нават цяпер я не адчуваў і не адчуваю сораму?

Ды, відаць, таму, што грошы на будоўлі дарма не даюць, што нялёгкая праца ў прарабаў — вартая павагі. Таму і карміць іх трэба адпаведна.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## ЧАЛАВЕК ГАЛОДНЫ НІ НА ШТО НЕ ГОДНЫ

Некалі да касавіцы, да цяжкай працы рыхтаваліся загадзя: прыводзілі ў парадак косы, граблі, вілы, як маглі, стараліся прыхаваць нейкага мяса ці сала, бо якраз яны дадавалі чалавеку сіл.

Стараліся, але ж не заўсёды маглі.

У тое лета кубел у Пятра аказаўся зусім пустым.

— Можа, свінчо якое заколем, каб гэтыя работы адолець? — прапанаваў ён жонцы.

— Ты хіба здурнеў, — уперлася рогам тая. — Лета на дварэ. Хто ж гэта свіней коле?

Пятро з ёй спрачацца не стаў — ведаў, што марная гэта справа: анічога ён не дакажа, толькі нервы сабе парве...

А пакуль, што называецца, рваў жылы: на бульбе з малаком цэлымі днямі касіў, шчыраваў у калгасе, а потым, надвячоркамі, шастаў па ўзлесках ды няўдобіцах, каб нейкай травы накасіць сабе, дакладней — сваім каровам.

Факт, што дадому ўвечары ён ледзь не прыпаўзаў: ногі не трымалі, схуднеў, зблажэў, баяўся, што назаўтра не ўстане... Вось і прыдумаў, як знайсці паратунак.

На золку неяк выйшаў з хаты і пакіраваў у хлеўчык. Пачухаў там спіну большаму парсюку. Той на радасцях брык і ляжыць — яшчэ і пуза падставіў... А гаспадар тым часам... жменьку проса яму ў вуха — усыпаў і ў хату вярнуўся, да жонкі пад бок.

Потым чуў праз сон, што ўжо развіднела, чуў, што Ганна карову падаіла і ў поле прагнала, пакарміла качак і курэй. Нарэшце пайшла да свіней і тут жа вярнулася.

— Уставай! — стала будзіць Пятра. — Нешта з нашым падсвінкам не тое: есці не ўзяў. Пайшлі ўдваіх паглядзім!

Пятро ў пакоры затупаў следам.

— Галавой, бач, матляе, — ледзь не плачучы казала Ганна. — Мабыць, захварэў?

— Слухай, ці гэта не шаленства? — пачухаў патыліцу гаспадар. — Трэба, мусіць, калоць, а то хвароба яшчэ на свінку перакінецца.

— Ну дык што ты цягнеш? Рабі што-небудзь! — загадала Ганна.

— Пайду па сваяка. Удвух лацвей будзе, — прызнаў Пятро. — А ты вады ў печ настаў — хай грэецца...

Хутка на падворку ўжо ва ўсю кіпела работа: мужчыны смалілі, мылі, разбіралі падсвінка. А скончыўшы гэту работу, выпілі па чарцы, з асалодай «прыгаварылі» патэльню скварак з блінамі ды пайшлі касіць.

...Акрыяў тады Пятро ад нармальнай ежы: у перадавіках хадзіў у калгасе. Ды і дома ўсё парабіў, бо яно ж і сапраўды: чалавек галодны ні на што не годны.

**Уладзімір Пугач,**
*а/г Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.*

## СУПАДЗЕННЕ З... УПАДЗЕННЕМ

Некалі гэта маленькая ціхая вёсачка была адметнай хіба сваімі брусніцамі ды рэчкай Брусяты, цераз якую быў перакінуты нешырокі драўляны мост. Служыў ён спраўна: людзі па ім хадзілі, машыны ездзілі... Але ж колькі іх было ў той час? Хіба «хуткая» да некага прымчыцца альбо газавікі з балонамі.

Першым, хто купіў легкавушку, быў сын бабы Ганны. Ён у Мінску жыў і, відаць, займаў неблагую пасаду, бо аднойчы выбраўся да маці на ўласным аўто. Гэта, вядома ж, зручна: што захацеў, з сабою ўзяў, калі захацеў, паехаў, прычым з камфортам...

Карацей, амаль дабраўся чалавек — засталося масток адолець ды за ім трохі вуліцы, як раптам...

Што там адбылося, цяжка сказаць: можа, у кіроўцы не хапіла навыкаў, можа, у роднай вёсцы ён хацеў фарсануць... А ў выніку, што называецца, не справіўся з кіраваннем, і аўтамабіль яго, паламаўшы парэнчы, «носам» уткнуўся ў ваду.

Гэта, вядома ж, была падзея! Да рэчкі сышліся ледзь не ўсе вяскоўцы: адны, каб паспачуваць чалавеку ды нешта параіць, другія — не без таго — каб пасмяяцца (бо не трэба, маўляў, выпендрывацца), трэція — каб паспадзявацца, што на месцы старога і сапраўды ўжо напаўразбуранага моста з'явіцца новы.

Сярод гэтых шматлікіх «гледачоў» былі, вядома ж, і дзеці: пяцікласнік Васілёк ва ўсе вочы глядзеў на «хвост» аўтамабіля, што ўзвышаўся над вадой, чытаў там кароткае слоўца «Волга».

Трэба сказаць, што навука давалася гэтаму дзіцяці нялёгка, але ў школу ён хадзіў з ахвотай.

І якраз там (супадзенне!), на ўроку геаграфіі, настаўнік неяк узяўся расказваць дзецям пра самыя вялікія рэкі. А заадно спытаў, ці не ведае хто, куды ўпадае Волга? Клас задумаўся.

— Я ведаю! — закрычаў Васілёк. — Волга ўпадае ў Брусяты.

Дзеці грымнулі рогатам.

— Куды-куды? — перапытаў настаўнік і тут жа папрасіў. — Падумай яшчэ, Вася, ты памыляешся.

— Ды не! Што тут думаць?! — абурыўся хлопчык. — Я на свае вочы бачыў!

— Ты не мог гэта бачыць, — настойваў географ, — бо Волга ўпадае ў Каспійскае мора.

— Няпраўда, вы ў нашай вёсцы каго хочаце спытайце, вам любы адкажа: у Брусяты! — не здаваўся Васілёк.

...«Несупадзенне з упадзеннем» высветлілася трохі пазней, калі Вася расказаў пра «Волгу» — пра машыну, якая з моста з'ехала ў рэчку і якую адтуль потым выцягвалі трактарам.

Так што адкрыцці ў галіне геаграфіі можа рабіць не толькі Калумб.

**Анатоль Палынскі,**
*г. Беразіно.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПА ВОЛІ ЛЁСУ?



## Выбар, які робім сёння, абавязкова, няхай і праз дзясяткі гадоў, нагадае аб сабе

ЯК паведамляюць афіцыйныя крыніцы, падчас тэракту ў англійскім Манчэстэры ніхто з беларускіх грамадзян не пацярпеў. З палёгкай уздыхнулася: дзякуй Богу, а потым і падумалася: а што беларусам рабіць у тым далёкім Манчэстэры? Але ўчора вечарам крыніца неафіцыйная — сяброўка па скайпе з Германіі — паведаміла, што пацярпелы, прынамсі адзін, усё ж ёсць. Дваццацігадовы Мікіта, сын нашай агульнай знаёмай Таццяны. Зрэшты, грамадзянства ў яго, як і ў маці, даўно брытанскае, таму і не ведалі пра яго нашы дыпламаты. У хлопца цяжкія раненні, цяпер ён у коме і ўрачы не даюць гарантыі, што, калі ён выжыве, вернецца да нармальнага жыцця. Маці б'ецца ў роспачы, з якой яна засталася фактычна сам-насам: муж паўтара года назад памёр, бацькоў у Беларусі таксама няма ў жывых, ні братоў, ні сясцёр. Тут жыве яшчэ Мікітаў біялагічны бацька, але калі і шукаць спачування і падтрымкі, дык у яго апошняга. Менавіта так мы паразважалі ўчора, ведаючы, як Таццяна з Мікалаем разводзіліся і сына дзялілі.

ЯНЫ былі прыгожай парай — маладзенькая стройная жонка, натуральная бландзінка з сінімі вачыма і чорнымі доўгімі веямі, і высокі, хударлявы, не па гадах сур'ёзны муж. Таццяна ў любой кампаніі прываблівала зачараваныя погляды — не толькі прыгажуня, але яшчэ і дасціпная разумніца. Мікола быў яе маўклівым ценем, было відаць, што ён жонку проста абажае і... пабойваецца. Бо ў жонкі былі планы на жыццё, якіх ён не падзяляў, — яна хацела жыць у палацы, ездзіць на дарагім аўто, насіць футра, адпачываць на моры. «Я — брыльянт, які патрабуе дарагой аправы», — ці то жартам, ці то ўсур'ёз часта паўтарала яна і ні ў чым сабе не адмаўляла, трацячы ўсе грошы на брэндавае адзенне і на дарагую касметыку. Муж стараўся як мог: працаваў на дзвюх работах, улез у крэдыты, але ж купіў прыстойную двухпакаёўку, даволі дарагую машыну. Таццяна, папрацаваўшы пасля заканчэння «меда» ў лабараторыі, заявіла, што гэта «сумна і нудна», і села мужу на шыю капітальна, адрэзаўшы, што на работу больш не пойдзе. Грошай на яе капрызы стала не хапаць, і яна пачала ўсім расказваць, што проста выйшла замуж не за таго чалавека.

Калі нарадзіўся Мікіта, мы падумалі, што страказа наша нарэшце супакоіцца. Тым больш што з таненькай лёгкай дзяўчынкі яна ператварылася ў кругленькую здаровую маладзіцу — паправілася Таццяна пасля родаў неймаверна, кілаграмаў на дваццаць пяць (і гэта, дарэчы, вельмі ёй пасавала). Але трэба было ведаць нашу прыяцельку! Ужо праз месяц яна адмовілася карміць дзіця, села літаральна на ваду, пайшла на нейкі адмысловы фітнес, за які аддала апошнія сямейныя зберажэнні, і тыя кілаграмы скінула праз паўгода. Дзіця займацца сабой ёй замінала, таму хлопчык быў кінуты на бабулю з дзядулем, а наведваў яго там бацька.

ТАЦЦЯНА ж часу дарэмна не траціла: выцыганіўшы ў мужа кругленькую суму (ён не мог ёй адмовіць), запісалася на курсы англійскай мовы. Курсы былі дарагія, але нейкія адмысловыя: мелі на ўвазе стажыраванне ў краіне носьбітаў мовы. Карацей, з'ездзіла наша Таццяна ў Лондан на тры месяцы і вярнулася адтуль, каб сабраць рэчы і аформіць развод: нейкім неймаверным чынам яна атрымала працоўную візу з умовай, што ў яе няма членаў сям'і, якіх яна можа перацягнуць за сабой.

Мікалай развод ёй нарэшце даў — сваёй каханай ён не мог ні ў чым адмовіць. Мікіту, праўда, адсудзіў сабе, дый Таццяна не настойвала, тым больш яе бацькі, маладыя пенсіянеры, былі гатовыя ўсяляк дапамагаць былому зяцю выхоўваць хлопчыка. Пра Таццяну гады два мы амаль не чулі: у Мікалая пацікавіцца не асмельваліся, каб не вярэдзіць балючае, маці яе таксама гаварыла пра дачку не з вялікай ахвотай. Ведалі толькі, што працуе яна там у нейкім пабе афіцыянткай і што не вельмі ёй там соладка.

Але Таццяна ўсё-ткі сваю мару здзейсніла: выйшла замуж за ўладальніка аўтарамонтнай майстэрні ў Манчэстэры. Шасцідзесяцігадовы халасцяк заўважыў маладую прыгожую афіцыянтку ў кавярні, дзе яна працавала. Даведаўшыся, што яна «руская», вырашыў нарэшце выправіць сваё халасяцкае становішча: славянскія жанчыны ў еўрапейцаў лічацца найлепшымі жонкамі. Атрымала наша сяброўка ўсё, што хацела: і дом, і аўто, і акіянскія круізы (немалады і непрыгожы муж, які ўсё гэта аплачваў, разглядаўся як не вельмі прыемны, але абавязковы дадатак). Адно было дрэнна: вельмі хацеў нашчадка, а Таццяна пасля той гісторыі з лішнімі кілаграмамі сама сабе сказала, што нараджаць больш ніколі не будзе. Калі ж муж дапёк з «дзіцячым пытаннем», нарэшце прызналася: ёсць, маўляў, у мяне ў Беларусі сын. І ўпарты англічанін загарэўся ідэяй «няшчаснага хлопчыка з беднай краіны» ўсынавіць. Калі ж Таццяна паспрабавала пярэчыць, паабяцаў развесціся.

І яна прыехала ў Мінск змагацца за Мікітку. Хлопчыку было ўжо пяць гадоў, маці ён бачыў толькі на фотках, «мамай» называў бабулю. Аб тым, што ёй хтосьці аддасць дзіця, і размовы быць не магло. Але ёй гэта ўдалося! Бацькоў угаварыла даволі хутка: маўляў, хлопец вырасце ў еўрапейскай краіне, атрымае добрую адукацыю, узровень жыцця там нашмат вышэйшы, дый не з чужым чалавекам — з маці будзе жыць. З мужам дамовіцца было нашмат цяжэй: з вачэй у таго ўжо ўпала заслона закаханага, нічога, акрамя злосці і крыўды, у яго не засталося. Да таго ж менавіта тады развалілася яго фірма, якую ствараў два гады.

І тады Таццяна сына ў мужа... купіла. Аддала ўсе яго пазыкі, закрыла крэдыты, купіла яму новую машыну, пакінула «статутны капітал» на новую фірму. За гэта ён падпісаў не толькі дазвол на вываз сына за мяжу, але і на яго ўсынаўленне іншаземцам.

Міколу я больш у Мінску не сустракала. Казалі агульныя знаёмыя, што нібыта спіўся, прадаў кватэру і падаўся ў глухую вёску на Віцебшчыне, у дзедаву хату. З Таццянай гадоў шэсць назад перасекліся на ўзбярэжжы Ла-Манша: прыехала праз праліў у бельгійскі гарадок, дзе мы адпачывалі, спецыяльна, каб пабачыцца. Прыгожая, дагледжаная, як лялька, яна лянівым голасам расказвала, як хораша ёй жывецца, як яна задаволеная, што забрала сына, як ён добра ведае англійскую і паспяхова вучыцца... Пасля на сувязь з ёй я не выходзіла (шчыра: не было жадання — і ўсё тут). Але ад сяброўкі ведала, што муж у Таццяны памёр ад раку, Мікіта паступіў ва ўніверсітэт, аўтамайстэрню яна прадала і жыве на працэнты ад банкаўскіх укладаў. Гэткая гламурная англічанка з амаль арыстакратычным ладам жыцця — усё так, як калісьці задумала ў юнацтве...

МЫ ўчора доўга пра гэта гаварылі. Разважалі, як літаральна за дваццаць гадоў Еўропа, якая атаясамлівалася з самым спакойным, багатым, сытым жыццём, ператварылася ў месца, дзе нават хадзіць па вуліцах трэба насцярожыўшыся. Шкадавалі вельмі Мікіту: хлопец стаў ахвярай лёсу, які за яго выбралі яго бацькі, выказвалі спадзяванні, што, дасць бог, ён усё-ткі выкараскаецца..

Ці спачувалі Таццяне? Вось на гэта пытанне станоўча я адказаць не магу.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 7** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №400/С-79015 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание бытовки), площадью 128,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. Составные части и принадлежности: цементобетонное покрытие, площадью 8, кв. м, ограждение из металлической сетки, протяженностью 48,0 м |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 440100000001006832, площадью 0,0325 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания бытовки), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д |
| **Начальная цена продажи** | 32 000 р. (тридцать две тысячи рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 3 200 р. (три тысячи двести рублей) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 8 июня 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 5 июня 2017 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

*http://grodnoino.by/*

---

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №1774210 **считать недействительным.**

УНП 100122726

---

## ЗАСО «ПРОМТРАНСИНВЕСТ»

предлагает принять участие в процедуре переговоров по выбору подрядной организации по объекту "Текущий ремонт арендуемых помещений ЗАСО «Промтрансинвест» в административном комплексе ОАО «Минский тракторный завод» по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 29». Документацию для переговоров можно получить при обращении по телефону (017) 228 14 69.

УНП 100357923

---

## ЗАО «АГРЭСТ»

УНН 100266857

**информирует акционеров о проведении внеочередного собрания акционеров 07.06.2017 г. в 12.00 по адресу: г. Минск ул. Филимонова, 2 с повесткой дня:**

- Отчет ревизионной комиссии ЗАО «Агрэст» за 2016 г. и выборы ревизионной комиссии ЗАО «Агрэст» на 2017 г.
- Подведение итогов работы ЗАО «Агрэст» за 2016 г.
- Утверждение итогов работы ЗАО «Агрэст» за 2016 г.
- Распределение дивидендов между акционерами ЗАО «Агрэст» за 2016 г.
- Распределение прибыли между Участниками ООО «Агрэст» за 5 месяцев 2017 г.
- Заключение договора о передаче полномочий единоличного исполнительного органа с индивидуальным предпринимателем Русиновичем В.Ф.

---

УНП 600422579

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
23.05.2017 г.
Сушко С.А.

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»
10.04.2017 (Протокол № б/н)

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДЕВЯТОГО ВЫПУСКА

**Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»)**

г. Минск 2017

Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 10.04.2017 № б/н вносит следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций девятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (номер государственной регистрации 5-200-02-2864, дата государственной регистрации 19.01.2017) (далее – Проспект эмиссии):

1. Абзац второй пункта 1.4 Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:
